Зарэгістравана
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
20 кастрычніка 1995 г.
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 0553

Зацверджаны Статут
Устаноўчым З'ездам
Беларускай асацыяцыі
журналістаў
16 верасня 1995 г.

Змяненні і дапаўненні Статута
зарэгістраваны
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
5 лютага 1998 г.

Змяненні і дапаўненні ў Статут
унесены 2-м З'ездам
20 снежня 1997 г.

Перарэгістравана
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
14 ліпеня 1999 г.
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 00204

Статут у новай рэдакцыі
прыняты нечарговым З'ездам
29 мая 1999 г.

Змяненні і дапаўненні Статута
Зарэгістраваны
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
10 жніўня 2000 г.

Змяненні і дапаўненні ў Статут
(Статут у новай рэдакцыі)
прыняты 4-м З'ездам
1 ліпеня 2000 г.

Змяненні і дапаўненні Статута
зарэгістраваны
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
16 кастрычніка 2003 г.

Змяненні і дапаўненні ў Статут
(Статут у новай рэдакцыі)
прыняты Радай
19 жніўня 2003 г.

Дзяржаўная рэгістрацыя змяненняў і
дапаўненняў Статута здзейснена
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
рашэнне ад 25 жніўня 2006 г. № 302
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 01515

Змяненні і дапаўненні ў Статут
(Статут у новай рэдакцыі)
прыняты 6-м З'ездам
2 чэрвеня 2006 г.

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь
ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ
змяненняў Статута
здзейснена
Рашэннем ад 09.09.2010 № 54
У Адзіным дзяржаўным рэгістры
юрыдычных асоб і індывідуальных
прадпрымальнікаў № 101111171
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 01515
Подпіс
М.П.

Змяненні ў Статут
прыняты Праўленнем
3 жніўня 2010 г.

# СТАТУТ

## Грамадскага аб'яднання

## «Беларуская асацыяцыя журналістаў»

Мінск
2010

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (далей па тэксце - ГА «БАЖ») добраахвотнае аб'яднанне грамадзян прафесійнага накірунку, якія займаюцца журналісцкай дзейнасцю або садзейнічаюць яе развіццю.

ГА «БАЖ» мае статус рэспубліканскага грамадскага аб'яднання і дзейнічае на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1.2. ГА «БАЖ» дзейнічае ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам «Аб грамадскіх аб'яднаннях», іншымі актамі заканадаўства і гэтым Статутам на прынцыпах добраахвотнасці, законнасці, самастойнасці і галоснасці.

1.3. ГА «БАЖ» з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае самастойны баланс, разліковы і іншыя рахункі ва ўстановах банкаў, пячатку, штампы, бланкі і сваю сімволіку, зарэгістраваную ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

ГА «БАЖ» ад свайго імя заключае дагаворы, набывае маёмасныя, уласныя немаёмасныя правы і нясе абавязкі, уступае ва ўзаемаадносіны з юрыдычнымі асобамі, выступае істцом і адказчыкам у судах.

1.4. ГА «БАЖ» адказвае па сваіх абавязацельствах маёмасцю, на якую, паводле дзеючага заканадаўства, можа быць накладзена спагнанне. ГА «БАЖ» не нясе адказнасці па абавязацельствах сваіх сяброў, а таксама арганізацыйных структур (філій), якія маюць правы юрыдычнай асобы, а яны не нясуць адказнасці па абавязацельствах ГА «БАЖ».

Справаводства ў ГА «БАЖ» вядзецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

ГА "БАЖ" штогод прадастаўляе Міністэрству юстыцыі Рэспублікі Беларусь справаздачу аб сваёй дзейнасці.

1.5. ГА «БАЖ» можа ўступаць у міжнародныя саюзы (асацыяцыі) грамадскіх аб'яднанняў ці ўдзельнічаць у іх стварэнні, падтрымліваць

прамыя міжнародныя кантакты і сувязі, заключаць адпаведныя пагадненні, якія не супярэчаць міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь.

1.6. Поўная і скарочаная назва ГА «БАЖ»:

на беларускай мове - Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (ГА “БАЖ”);

скарочаная назва - ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»;

абрэвіятура - ГА "БАЖ";

на рускай мове - Общественное объединение «Белорусская ассоциация журналистов»;

скарочаная назва - ОО «Белорусская ассоциация журналистов»;

абрэвіятура - ОО "БАЖ";

на англійскай мове - Public Organization "Belarusian Association of Journalists";

скарочаная назва - PO "Belarusian Association of Journalists";

абрэвіятура - PO "BAJ".

1.7. Юрыдычны адрас ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»: 220030, г. Мінск, вул. Камсамольсая, 7 - 32.

## 2. АСНОЎНЫЯ МЭТЫ, ЗАДАЧЫ, ПРАДМЕТ І МЕТАДЫ ДЗЕЙНАСЦІ ГА «БАЖ»

2.1. Асноўнай мэтай дзейнасці ГА «БАЖ» з'яўляецца:

2.1.1. Садзейнічанне рэалізацыі грамадзянскіх, эканамічных, сацыяльных, культурных і прафесійных правоў і законных інтарэсаў сябраў арганізацыі, іх творчаму самавыяўленню і росту прафесійнага майстэрства, стварэнне ўмоў для забеспячэння свабоды слова і друку, права на беспярашкоднае атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі.

2.2. Асноўнымі задачамі ГА «БАЖ» з'яўляюцца:

2.2.1. Абарона правоў і законных інтарэсаў сябраў ГА "БАЖ" у дзяржаўных органах і міжнародных арганізацыях.

2.2.2. Садзейнічанне сябрам ГА «БАЖ» у стварэнні матэрыяльна-тэхнічных, арганізацыйных і іншых неабходных умоў для дзейнасці і павышэння прафесійнага ўзроўню.

2.2.3. Распрацоўка цывілізаванай праграмы развіцця СМІ, якая павінна стварыць спрыяльныя ўмовы для іх функцыянавання на Беларусі.

2.2.4. Развіццё адносін з журналісцкімі арганізацыямі іншых краін свету.

ГА «БАЖ» можа вырашаць і іншыя задачы, якія вынікаюць з мэты Статута.

2.3. Прадметам дзейнасці ГА "БАЖ" з'яўляецца кансалідацыя і каардынацыя намаганняў сяброў арганізацыі з мэтай павышэння прафесійнага ўзроўню.

2.4. Для выканання статутнай мэты і задач ГА «БАЖ» выкарыстоўвае наступныя метады:

2.4.1. Ажыццяўляе навуковую, асветніцкую, метадычную, інфармацыйную дзейнасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

2.4.2. Займаецца выдавецкай і іншай дзейнасцю, не забароненай заканадаўствам.

2.4.3. Аказвае юрыдычную дапамогу сябрам ГА «БАЖ», прадстаўляе іх інтарэсы ў судах і іншых дзяржаўных установах.

2.4.4. Вядзе маніторынг парушэнняў заканадаўства аб СМІ.

2.4.5. Стварае ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку клубы, цэнтры, творчыя майстэрні і іншыя адпаведныя структуры, арганізоўвае канферэнцыі, семінары для журналістаў, а таксама стажыроўкі па абмену вопытам.

2.4.6. Ажыццяўляе кантроль за выкананнем сябрамі ГА «БАЖ» Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі і разглядае скаргі на іх парушэнне.

2.4.7. Заахвочвае сваіх сябраў за дасягненне высокіх паказчыкаў у прафесійнай дзейнасці альбо за прынцыповасць у абароне правоў і законных інтарэсаў сябраў ГА «БАЖ».

2.4.8. Заснsocvae згодна з дзеючым заканадаўствам сродкі масавай інфармацыі, распаўсюджвае інфармацыю аб сваёй дзейнасці.

2.4.9. Для дасягнення статутнай мэты і задач ГА «БАЖ» можа выкарыстоўваць іншыя метады дзейнасці, не забароненыя законам.

## 3. СЯБРОЎСТВА Ў ГА «БАЖ»

3.1. Сябрам ГА «БАЖ» можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, замежны грамадзянін або асоба без грамадзянства, якая дасягнула паўналецця, ажыццяўляе журналісцкую дзейнасць або садзейнічае яе развіццю ў Рэспубліцы Беларусь, прымае ўдзел у рэалізацыі мэты і задач ГА «БАЖ», прызнае і выконвае гэты Статут і Дэкларацыю прынцыпаў прафесійнай этыкі журналіста, зацверджаную З'ездам ГА «БАЖ».

3.2. Сяброўства ў ГА «БАЖ» фіксаванае. Праўленне ГА "БАЖ" ажыццяўляе агульны ўлік сябраў ГА «БАЖ».

Спіс сябраў складаецца на падставе заяў прынятых у ГА "БАЖ", а таксама пратаколаў пасяджэнняў філій і Праўлення аб прыёме ў сябры БАЖ.

3.3. Прыём у сябры ажыццяўляецца паводле рашэння філіі ГА «БАЖ» на падставе асабістай заявы ўступаючага і пры наяўнасці не менш як дзвюх пісьмовых рэкамендацый сябраў ГА «БАЖ».

Форма заявы зацвярджаецца Праўленнем.

У выпадках, калі на тэрыторыі адміністратыўна-тэрытарыяльнай адзінкі адсутнічае філія ГА «БАЖ», прыём у сябры ажыццяўляецца на тых жа падставах Праўленнем.

Рашэнне філіі аб прыёме ў сябры ГА «БАЖ» павінна быць зацверджана Праўленнем, якому ў 2-тыднёвы тэрмін накіроўваюцца копіі пратакола пасяджэння філіі і заявы асобы, прынятай у філію.

3.4. У выпадку адмоўнага рашэння філіі пытанне аб сяброўстве ў ГА «БАЖ» можа быць разгледжана Праўленнем ГА «БАЖ» на падставе пісьмовай заявы ўступаючага ці сябраў ГА «БАЖ», якія далі яму рэкамендацыі.

3.5. Сябрам ГА «БАЖ» па іх заяве можа выдавацца пасведчанне адпаведнага ўзору.

3.6. Сябар ГА «БАЖ» мае права:

– прымаць удзел у мерапрыемствах ГА «БАЖ», у працы органаў кіравання і кантролю з правам дарадчага голасу, а таксама выбіраць і быць абраным у гэтыя органы;

– атрымліваць інфармацыю ад кампетэнтных асоб ГА «БАЖ», яго выбарных органаў і ўносіць прапановы па пытаннях дзейнасці ГА «БАЖ»;

– атрымліваць дапамогу і абарону ад ГА «БАЖ» у адпаведнасці з заканадаўствам і Статутам;

– свабодна выйсці з ГА «БАЖ».

3.7. Сябры ГА «БАЖ» абавязаны:

– выконваць патрабаванні гэтага Статута і Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі журналіста;

– удзельнічаць у выкананні мэты і задач ГА «БАЖ»;

– плаціць членскія ўзносы ў памеры, вызначаным Радай ГА «БАЖ».

3.8. Выхад сябраў ГА «БАЖ» ажыццяўляецца паводле пісьмовай або вуснай заявы.

3.9. Выключэнне з сябраў ГА «БАЖ» ажыццяўляецца па рашэнні філіі ці Праўлення, калі за яго пададзена не менш за 2/3 галасоў прысутных на сходзе філіі (Праўлення), у выпадку грубага ці неаднаразовага парушэння Статута.

3.10. Па пісьмовай заяве выключанага пытанне аб сяброўстве можа быць разгледжана Радай, якая мае права адмяніць рашэнне філіі (Праўлення).

3.11. Асобам, якія ўнеслі вялікі ўклад ва ўмацаванне свабоды друку на Беларусі, Рада можа надаваць званне ганаровага сябра ГА «БАЖ» з выдачай адпаведнага дыплома.

## 4. СТРУКТУРА, ВЫШЭЙШЫ І ВЫБАРНЫЯ ОРГАНЫ ГА «БАЖ»

4.1. Аснову ГА «БАЖ» складаюць раённыя, гарадскія, рэгіянальныя (створаныя на тэрыторыі горада і раёна, двух раёнаў ці гарадоў, або іншых тэрытарыяльных адзінак) арганізацыі-філіі. Філіі ажыццяўляюць сваю дзейнасць у межах Статута. Рашэнне аб стварэнні філіі прымае Праўленне ГА «БАЖ».

4.2. Філіі ствараюцца пры наяўнасці трох і болей сябраў ГА «БАЖ», якія пражываюць на адной тэрыторыі і рэгіструюцца ў Праўленні ГА «БАЖ».

Філіі могуць быць нададзены правы юрыдычнай асобы са згоды Рады ГА «БАЖ».

4.3. Вышэйшым органам філіі з'яўляецца агульны сход.

Да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу філіі адносяцца:

– вызначэнне структуры, формы і метадаў дзейнасці выбарных органаў філіі;

– абранне тэрмінам на тры гады старшыні філіі, а пры наяўнасці пяці і больш сябраў - яго намесніка, скарбніка і рэвізора, - заслухоўванне іх справаздач;

– разгляд пытанняў аб датэрміновым скасаванні паўнамоцтваў старшыні і іншых выбарных органаў філіі;

– абранне дэлегатаў на З̓езд ГА «БАЖ»;

– прыём у сябры ГА «БАЖ», выключэнне з сябраў ГА «БАЖ».

4.4. Старшыня філіі склікае і вядзе агульныя сходы, арганізоўвае дзейнасць яе сяброў па выкананні рашэнняў органаў філіі і вышэйшых органаў ГА «БАЖ», адказвае за вядзенне спісу сяброў філіі, прадстаўляе філію ў дзяржаўных органах і грамадскіх арганізацыях.

Старшыня філіі можа прадстаўляць інтарэсы ГА "БАЖ" на адпаведнай тэрыторыі на падставе даверанасці.

4.5. Скарбнік (дзе яго няма - старшыня) філіі збірае членскія ўзносы, вядзе скарбовыя лісты.

4.6. Кантрольным органам філіі з'яўляецца рэвізор, які праводзіць свае праверкі не радзей за адзін раз на год. Вынікі праверак зацвярджаюцца агульным сходам філіі.

4.7. Агульны сход філіі ўпаўнаважаны прымаць рашэнні, калі ў ім узялі ўдзел больш за палову сяброў філіі. Рашэнні агульнага сходу філіі прымаюцца простай большасцю галасоў ад прысутных на сходзе сяброў (акрамя выпадку, прадугледжанага п.3.9. Статута).

Рашэнні агульнага сходу філіі, якія не адпавядаюць заканадаўству, Статуту ГА "БАЖ", рашэнням кіруючых і выбарных органаў, могуць быць адменены Праўленнем.

Рашэнні філій, звязаныя з выкарыстаннем матэрыяльных сродкаў, перададзеных філіі ў карыстанне рашэннем Праўлення ГА «БАЖ», павінны зацвярджацца Праўленнем.

4.8. Вышэйшым органам ГА «БАЖ» з'яўляецца З'езд, які склікаецца Радай не радзей за адзін раз на 3 гады. Нечарговы З'езд склікаецца па рашэнні Рады, па патрабаванні Кантрольна-рэвізійнай камісіі ці па ініцыятыве не менш за 1/3 сяброў ГА «БАЖ».

Тэрмін правядзення, парадак вылучэння дэлегатаў, нормы прадстаўніцтва і парадак работы З'езда вызначаюцца Радай і аб'яўляюцца не пазней як за 20 дзён да прызначанага тэрміну.

З'езд упаўнаважаны прымаць рашэнні, калі ў ім узялі ўдзел больш за палову абраных дэлегатаў. Рашэнні З'езда прымаюцца большасцю галасоў удзельнікаў З'езда, рашэнні, звязаныя са Статутам, а таксама аб спыненні дзейнасці ці рэарганізацыі ГА "БАЖ", - не менш за 2/3 галасоў удзельнікаў З'езда. Форма галасавання вызначаецца З'ездам.

4.9. Да выключнай кампетэнцыі З'езда адносяцца:

– прыняцце Статута ГА «БАЖ», унясенне ў яго змяненняў і дапаўненняў (акрамя выпадкаў, прадугледжаных п.4.13 Статута);

– вызначэнне асноўных напрамкаў і форм дзейнасці ГА «БАЖ»;

– абранне тэрмінам на тры гады Рады, Праўлення, Старшыні, Намеснікаў старшыні, Кантрольна-рэвізійнай камісіі, Камісіі па этыцы;

– заслухоўванне справаздач кіруючых, кантрольных органаў і адказных асоб ГА «БАЖ», Камісіі па этыцы;

– зацвярджэнне справаздачы аб даходах і расходах ГА «БАЖ»;

– прыняцце рашэння аб спыненні дзейнасці і рэарганізацыі ГА «БАЖ».

З'езд можа разглядаць і іншыя пытанні, якія вынікаюць са статутнай мэты і задач, у тым ліку аб адмене рашэнняў створаных ім органаў, якія не адпавядаюць заканадаўству і Статуту ГА "БАЖ".

4.10. Кіруючым органам ГА «БАЖ» з'яўляецца Рада ГА «БАЖ».

У склад Рады ўваходзяць сябры Праўлення, а таксама іншыя сябры ГА «БАЖ», абраныя на З'ездзе.

Рада склікаецца на пасяджэнні не радзей як два разы на год. Пасяджэнні Рады склікаюцца Праўленнем ці не менш за 1/3 сябраў Рады.

Рада ўпаўнаважана прымаць рашэнні, калі ў пасяджэнні Рады прынялі ўдзел больш за палову яе сябраў.

Рашэнні Рады прымаюцца простай большасцю галасоў ад прысутных.

4.11. Рада:

– арганізуе выкананне рашэнняў З'езда;

– вызначае агульныя накірункі выкарыстання сродкаў і маёмасці ГА "БАЖ";

– уносіць змяненні і дапаўненні ў Статут адпаведна змяненням у заканадаўстве, а таксама пры змене юрыдычнага адраса;

– абірае з ліку сябраў Рады сябраў Праўлення замест тых, што выбылі з яго складу;

– прымае рашэнні аб удзеле ў стварэнні або ўступленні ў міжнародныя саюзы (асацыяцыі) грамадскіх аб'яднанняў;

– вызначае памер і перыядычнасць уплаты членскіх узносаў;

– прымае рашэнні аб стварэнні і ліквідацыі юрыдычных асоб, зацвярджае іх Статут і кіраўнікоў;

– вырашае іншыя пытанні дзейнасці ГА «БАЖ», якія не належаць да выключнай кампетэнцыі З’езда.

4.12. Праўленне з'яўляецца выканаўча-распарадчым органам ГА «БАЖ». Праўленне ажыццяўляе бягучае кіраўніцтва ў перыяд паміж пасяджэннямі Рады дзеля выканання яе рашэнняў і рашэнняў З'езда.

У склад Праўлення ўваходзяць Старшыня, 4 Намеснікі старшыні, а таксама сябры ГА «БАЖ», абраныя на З'ездзе ці Радай ГА «БАЖ» у адпаведнасці з п.4.11.

4.13. Праўленне ГА «БАЖ»:

– распараджаецца сродкамі і маёмасцю ГА «БАЖ» згодна з заканадаўствам і агульнымі накірункамі, вызначанымі Радай;

– прымае рашэнні аб набыцці, распараджэнні і адчужэнні маёмасці;

– каардынуе працу філій, зацвярджае іх рашэнні аб прыёме ў сябры ГА «БАЖ», а таксама прымае ў сябры ГА «БАЖ» у выпадках, прадугледжаных п.3.3. Статута;

– наладжвае сувязі з дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі, грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі арганізацыямі ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі, рыхтуе мерапрыемствы ГА «БАЖ»;

– арганізоўвае юрыдычную дапамогу сябрам ГА «БАЖ»;

– зацвярджае ўзоры пячаткі, штампа, сімволікі ГА «БАЖ», пасведчання сябра ГА «БАЖ», іншых унутрыарганізацыйных дакументаў, узгадняе штатны расклад;

– вырашае іншыя пытанні, якія не належаць да выключнай кампетэнцыі З'езда ці кампетэнцыі Рады ГА «БАЖ».

4.14. Пасяджэнні Праўлення праводзяцца не радзей за адзін раз ў месяц і склікаюцца па ініцыятыве Старшыні, Намеснікаў старшыні ГА «БАЖ» або не менш за 1/3 сябраў Праўлення.

Рашэнні Праўлення прымаюцца простай большасцю галасоў ад агульнага складу Праўлення.

4.15. Старшыня ажыццяўляе аператыўнае кіраўніцтва Радай і Праўленнем, валодае правамі кіраўніка юрыдычнай асобы, прадстаўляе ГА «БАЖ» у адносінах з дзяржаўнымі і недзяржаўнымі (у тым ліку замежнымі) органамі, арганізацыямі, прадпрыемствамі, установамі, а таксама грамадзянамі.

Старшыня (а па яго даручэнні ці даручэнні Праўлення - Намеснік старшыні):

– ажыццяўляе аператыўнае кіраўніцтва дзейнасцю ГА «БАЖ», якая вынікае з яе мэтаў і задач;

– арганізуе выкананне рашэнняў вышэйшага і кіруючых органаў ГА «БАЖ»;

– зацвярджае штатны расклад ГА «БАЖ»;

– прымае рашэнні па бягучых пытаннях дзейнасці ГА «БАЖ»;

– забяспечвае вядзенне кнігі ўліку заўваг і прапаноў, разгляд зваротаў сябраў ГА "БАЖ" і грамадзян у адпаведнасці з заканадаўствам, у межах сваёй кампетэнцыі робіць неабходныя захады для іх поўнага і своечасовага разгляду;

– наймае і звальняе штатных супрацоўнікаў, прымае да іх захады заахвочвання і выносіць дысцыплінарныя спагнанні, арганізуе вядзенне справаводства і справаздач, выконвае іншыя абавязкі.

4.16. Намеснікі старшыні каардынуюць работу ГА «БАЖ» па вызначаных напрамках дзейнасці ў адпаведнасці з рашэннямі Праўлення.

4.17. Пры выхадзе з ГА «БАЖ» ці немагчымасці выконваць абавязкі Старшыні гэтыя абавязкі па рашэнні Рады пераходзяць да аднаго з Намеснікаў старшыні на тэрмін да склікання З'езда ГА «БАЖ».

4.18. Кантрольным органам ГА «БАЖ» з'яўляецца Кантрольна-рэвізійная камісія. Са свайго складу Кантрольна-рэвізійная камісія абірае старшыню камісіі.

Кантрольна-рэвізійная камісія збіраецца на пасяджэнні не радзей за адзін раз на год. Рашэнні Кантрольна-рэвізійнай камісіі прымаюцца большасцю ў 2/3 галасоў ад яе складу.

4.19. Кантрольна-рэвізійная камісія ажыццяўляе:

– кантроль за выкананнем Статута ў дзейнасці ГА «БАЖ»;

– кантроль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю, захаванасцю маёмасці ГА «БАЖ». Не радзей за адзін раз на год праводзіць планавую рэвізію, пры неабходнасці звяртаецца па паслугі ў аўдытарскую арганізацыю, аб выніках рэвізіі інфармуе Раду ГА "БАЖ".

– аказвае дапамогу рэвізорам філій.

4.20. Сябры Кантрольна-рэвізійнай камісіі не могуць уваходзіць у склад Рады, Праўлення, займаць пасады кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў ГА «БАЖ». Сябры Кантрольна-рэвізійнай камісіі могуць удзельнічаць у працы пасяджэнняў кіруючых органаў ГА «БАЖ» з правам дарадчага голасу.

4.21. У структуры ГА «БАЖ» дзейнічае Камісія па этыцы, якая разглядае скаргі па фактах парушэння сябрамі ГА «БАЖ» Дэкларацыі прынцыпаў прафесійнай этыкі. Са скаргамі маюць права звяртацца органы

дзяржаўнага кіравання, філіі, рэдакцыі газет, любы сябар ГА «БАЖ», а таксама зацікаўленыя грамадзяне.

У склад Камісіі па этыцы ўваходзяць сябры ГА «БАЖ», якія валодаюць высокімі прафесійнымі і этычнымі якасцямі.

Камісія па этыцы дзейнічае на аснове Палажэння, якое распрацоўвае і зацвярджае Рада.

4.22. У Камісію па этыцы ўваходзяць сем сябраў ГА «БАЖ», якія абіраюцца на З'ездзе. Сябры Камісіі абіраюць са свайго складу старшыню.

4.23. Камісія па этыцы адкрытым галасаваннем большасцю галасоў ад свайго агульнага складу выпрацоўвае рэкамендацыі, якія разглядаюцца Радай. Рашэнне Рады па рэкамендацыях Камісіі па этыцы можа быць абскарджана на З'ездзе.

4.24. Рашэнні калегіяльных органаў ГА «БАЖ» афармляюцца пратаколамі.

Рашэнні органаў ГА "БАЖ" могуць быць абскарджаны зацікаўленымі асобамі ў вышэйшыя органы ці ў Кантрольна-рэвізійную камісію ГА "БАЖ".

## 5. КРЫНІЦЫ І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ ЎЛАСНАСЦІ ГА «БАЖ»

5.1. Ва ўласнасці ГА «БАЖ» могуць знаходзіцца будынкі, збудаванні, жыллёвы фонд, абсталяванне, транспарт, інвентар, грашовыя, валютныя сродкі, акцыі, іншыя каштоўныя паперы і іншая маёмасць, неабходная для ажыццяўлення прадугледжанай Статутам дзейнасці.

5.2. Уласнікам маёмасці грамадскага аб'яднання, у тым ліку маёмасці, якая знаходзіцца ў арганізацыйных структур гэтага грамадскага аб'яднання, з'яўляецца грамадскае аб'яднанне. Арганізацыйныя структуры грамадскага аб'яднання маюць права распараджацца маёмасцю грамадскага аб'яднання ў межах, вызначаных Статутам гэтага грамадскага аб'яднання.

5.3. Арганізацыйныя структуры грамадскага аб'яднання, надзеленыя правамі юрыдычнай асобы, маюць асобны баланс і бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак, а таксама могуць мець іншыя рахункі ў банках, небанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях.

5.4. Грашовыя сродкі ГА «БАЖ» фарміруюцца з:

– членскіх узносаў;

– мэтавага фінансавання ГА «БАЖ» і асобных праектаў з боку грамадзян і арганізацый;

– добраахвотных ахвяраванняў;

– іншых не забароненых заканадаўствам паступленняў.

5.5. ГА "БАЖ" можа ажыццяўляць ва ўстаноўленым парадку прадпрымальніцкую дзейнасць у той ступені, у якой яна неабходна для яе статутных мэтаў, дзеля якіх яна створана, адпавядае гэтым мэтам і адказвае прадмету дзейнасці. Такая дзейнасць можа ажыццяўляцца толькі праз стварэнне камерцыйных арганізацый і (альбо) удзелу ў іх.

5.6. Сродкі і маёмасць ГА «БАЖ» выкарыстоўваюцца на ажыццяўленне статутнай дзейнасці, на ўтварэнне, пры неабходнасці, фондаў і рэзерваў ГА «БАЖ».

5.7. Паўнамоцтвы ГА «БАЖ», звязаныя з правам уласнасці, у прыватнасці, прыняцце рашэнняў аб набыцці, распараджэнні і адчужэнні ўласнасці, ажыццяўляе Праўленне ў накірунках, вызначаных Радай.

5.8. ГА «БАЖ» можа перадаваць сваім філіям у карыстанне частку сваёй маёмасці для ажыццяўлення статутных мэтаў і задач ГА «БАЖ».

5.9. ГА «БАЖ» выплачвае падаткі і ажыццяўляе разлікі ў парадку і памерах, устаноўленых дзеючым заканадаўствам, нясе адказнасць за паўнату, дакладнасць і своечасовасць прадастаўлення справаздачнасці.

# 6. ПАРАДАК ЛІКВІДАЦЫІ ГА «БАЖ» І ЯЕ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ СТРУКТУР

6.1. Ліквідацыя ГА «БАЖ», яе рэарганізацыя ажыццяўляюцца па рашэнні З'езда, прынятым не менш 2/3 галасоў ад агульнай колькасці абраных дэлегатаў, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам.

6.2. Сродкі і маёмасць, што застаюцца пасля ліквідацыі ГА «БАЖ», пасля задавальнення маёмасных прэтэнзій выкарыстоўваюцца ліквідацыйнай камісіяй у адпаведнасці з мэтамі і задачамі ГА «БАЖ».

6.3. Дакументы ГА «БАЖ» пасля ліквідацыі ва ўстаноўленым парадку ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам перадаюцца на захаванне ў адпаведныя ўстановы дзяржаўнага архіву Рэспублікі Беларусь.

6.4. Рашэнне аб ліквідацыі ГА «БАЖ» накіроўваецца ў адпаведны рэгіструючы орган і публікуецца ў перыядычным друкаваным выданні, вызначаным актамі заканадаўства.

6.5. Філіі ГА «БАЖ» спыняюць сваю дзейнасць па рашэнні Праўлення, прынятым па прапанове сходу філіі альбо па ініцыятыве Праўлення.

6.6. Для спынення дзейнасці філій, маючых правы юрыдычнай асобы, Рада ўтварае ліквідацыйную камісію, вызначае яе старшыню і парадак дзейнасці.

Ліквідацыйная камісія выконвае свае функцыі ў адпаведнасці з заканадаўствам.

6.7. Сродкі і маёмасць філіі пасля задавальнення маёмасных прэтэнзій уваходзяць у склад маёмасці ГА «БАЖ».